# ЗМЕСТ

3 КСЕНІЯ ЗАРЭЦКАЯ. Агонія. *Апавяданне*
24 ЯЎГЕНІЯ ЛЯЗО. Гульня з агнём. *Вершы*
27 ЛЮДМІЛА ШЧЭРБА. Фісташкавы кароль. *Вершы*
30 АНТОН ШУКАЎ. *Замалёўкі*
34 ПЯТРО ЖАЎНЯРОВІЧ. У бясконцасці часу. *Вершы*
36 УЛАДЗІМІР ЗЯЗЮЛІН. Не пытаецца сэрца. *Вершы*
38 КАЗІМІР КАМЕЙША. Дарога ў людзі. *Трыпціх адной дарогі*

## КРУГЛЫ СТОЛ

66 Дэпрэсіўная моладзь: як літаратура паглыбілася ў чалавека. *Падрыхтавала Ксенія Зарэцкая*

## ІНТЭРВ'Ю

74 АЛЕСЬ КАМАРОЎСКІ. Калі спорт нараджае прозу. *Гутарыла Наталля Святлова*

## З АРХІВАЎ

79 ЭМАНУІЛ ІОФЕ. Якуб Колас і палітычныя рэпрэсіі

## ЛІТАРАТУРНЫ СВЕТ

89 АЛЕНА КІСЕЛЬ. «Век людзей» Маргарыты Латышкевіч: нацыянальнае фэнтэзі са скандынаўскім каларытам
93 ЗІНОВІЙ ПРЫГОДЗІЧ. Сэрцам паэта

## МАСТАЦТВА

95 ІГАР ЦІТКОЎСКІ. Слуцкімі сцежкамі мастацкага краязнаўства. *Гутарыў Кастусь Лешніца*

## NON-FICTION

97 ЗІНАІДА ДУДЗЮК. Сляды мінулага

108 *Спіс публікацый часопіса «Маладосць» за 2025 год*

# КСЕНІЯ ЗАРЭЦКАЯ



## Агонія

Апавяданне

Зарэцкая Ксенія нарадзілася 10 лютага 2002 года ў горадзе Кобрыне Брэсцкай вобласці. Скончыла факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. З мастацкай прозай друкавалася ў раённай газеце «Кобрынскі веснік», альманахах «аБДУмана» і «Першацвет», зборніках «Размова з люстэркам» і «Вазьмі сваю святыльню». Публіцыстычныя і крытычныя артыкулы публікаваліся на старонках часопісаў «Маладосць», «На экранах», «Театральный журнал» і «Бярозка», газет «Культура», «ЛіМ», «Переходный возраст». Працуе рэдактарам. Жыве ў Мінску.

*Ханахакі — небяспечнае захворванне, з-за якога ўнутры чалавека пачынаюць расці кветкі, падпяразваюць лёгкія, а потым і ўсе ўнутраныя органы, што ўскладняе дыханне і ў выніку робіць яго зусім немагчымым. Узнікае гэтая хвароба ад неўзаемнага кахання і не мае антыдотаў. У першыя дні чалавек адкашлівае асобныя пялёсткі. Праз тыдні — кветкі. На апошняй стадыі — цэлыя суквецці. Вылечыцца можна толькі дзякуючы шчыраму прызнанню каханага.*

### Боль

– Мацкевіч! — ён паклікаў яе, выштурхваючы словы з такой напругай, быццам іх прывязалі да паднябення сталёвымі канатамі.

— Рыгор?

Усе яго сілы сышлі на тое, каб не скурчыцца ад яе абыякава-спакойнага голасу. Прыціснуў рукі да жывата, паморшчыўся, расцягнуў вусны ва ўсмешцы — на злосць ёй. Як быццам той не пляваць. Як быццам карыя вочы, якія не так даўно пачалі нагадваць яму пра янтар і гарачы шакалад (божа, што за пошлае, дурное параўнанне), не ператварыліся ўжо як месяц у пустыя гладкія сподкі, у якіх нічога немагчыма разглядзець. Не таму што Ліза нарэшце навучылася хаваць эмоцыі, раней бачныя нават па адной яе постаці. Таму што ў ёй нічога не засталося.

— Нам трэба пагаварыць,— Рыгор закашляўся, не скончыўшы фразу, павярнуўся да дзяўчыны спінай. Высунуў з нагруднай кішэні пінжака белую насоўку — іх цяпер хапала максімум на палову гадзіны — і выплюнуў у яе кветку дзьмухаўца. Ярка-жоўтае суквецце, вымазанае ў крыві. Ён бы засмяяўся ад іроніі. Шкада толькі, што ўсе сілы сышлі на папярэднюю непатрэбную ўсмешку.

# ЯЎГЕНІЯ ЛЯЗО



## Гульня з агнём

Вершы

Лязо (Касіловіч) Яўгенія нарадзілася 4 ліпеня 2004 года ў Мінску. Скончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, цяпер — у магістратуры. Піша вершы, прозу і крытычныя артыкулы. Аўтар двух зборнікаў вершаў: «Пальба па галубах» і «Гульня з агнём».

### Гарчычнае зерне

Гарчычнае зерне найменшае
на зямлі з насення.
Але й яно вялікі плод прыносіць,
калі вырастае ў дрэва.
Каб дробнае зернейка
ў тоўстае дрэва вырасціць,
Важна яго пасадзіць у добрую глебу,
Каб птушкі нябесныя яго не падзюбалі,
Чалавечыя ногі ў пыл не ўтапталі.
А потым маленькі парастак пільнаваць,
Даглядаць, паліваць, каб сонейка
раслінку не выпаліла,
Пустазелле выдзіраць з каранём,
Каб яно наша зерне не задушыла.
Калі дрэўца пачне пладаносіць,
важна яго ўдабраць,
Каб плод добры
прыносіла ў трыццаць,
шэсцьдзясят,
сто разоў больш за самое сябе.
Хрыстос, Які ўзрасціў
гэтае дрэўца Сваімі рукамі,
Аднойчы прыйдзе сабраць плады.
Ці знойдзе Ён дрэўца на месцы?
За гэта адкажам я і ты.

### Дыямент

Дыямент — самы каштоўны камень.
Сваёй прыгажосцю абавязаны Богу за тое,
Што Госпад працуе над ім,
Зачышчае ад брудных грахоў
і лішняга пылу.
За тое, што Ён надае дыяменту
прыгожую форму.
Майстар ведае:
Кожны камень мусіць
быць пэўных прапорцый.
«Сумна!» — скажаце вы, але неабходна,
Каб дыямент змог адлюстраваць святло,
Не рассеяўшы яго.
Калі стандарты парушыць,
камень не будзе блішчаць.
Мы не будзем парушаць Божае слова,
Каб несці святло ў гэты свет.

# ЛЮДМІЛА ШЧЭРБА



## Фісташкавы кароль

Вершы

Шчэрба Людміла нарадзілася 29 мая 1973 года ў Мінску. Скончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, аспірантуру Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы НАН Беларусі. Працавала рэдактарам аддзела паэзіі часопіса «Першацвет», вядучым стылістычным рэдактарам газеты «Сям'я» і ў іншых выданнях, цяпер — вядучы літаратурны рэдактар «Беларускага гістарычнага часопіса». Паэт, празаік, спявачка. Вершы і проза друкаваліся ў рэспубліканскай літаратурнай перыёдыцы. Аўтар раманаў «Уладар рыбаў», «Урб@н.М: Адзін дзень не майго жыцця», кнігі паэзіі «Я пакідаю сонца тут...».

✦ ✦ ✦

Сонца хаваецца
па лісцях
у прадчуванні зімы,
але выдае сябе
жоўтым колерам,
чырвонымі апёкамі.
Аскепкі сонца
кружляюць у паветры.
Людзі завуць гэта вальсам.
Лісце не вытрымлівае
сонечнай жарсці,
ападае на зямлю,
а думала,
што можа паляцець
у вырай,
адштурхнуўшыся ад галінкі.
Людзі завуць гэта золатам.
Нясуць сонца дадому.
Складзеныя далоні кніг моляцца,
каб захаваць сонца ў лісці.
Людзі завуць гэта душой.
Чулае да прыгажосці вока
выраніць слязу
на засохлы ліст,
каб загаіць
пякучыя абяцанні сонца.
Людзі завуць гэта каханнем.
Сонца іржавее
па дварах і парках,
кідаецца пад ногі,
каб затуліцца ад ветру.
Людзі завуць гэта восенню.

✦ ✦ ✦

Ты мой фісташкавы кароль,
а можа, проста ілюзія...
Алюзія
на ўсе фільмы пра каханне,
дыхання
адвечныя арэлі.
Самлелі
словы без прабелаў,

# АНТОН ШУКАЎ

## Замалёўкі



Шукаў Антон нарадзіўся 23 сакавіка 2002 года ў горадзе Іўе Гродзенскай вобласці. Вучыцца ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі на кафедры кампазіцыі. Ягоная музыка выконвалася рознымі ансамблямі Расіі і Еўропы. У музычнай і літаратурнай творчасці даследуе чалавечую асобу з розных бакоў праз прызму філасофскіх пытанняў экзсістэнцыялізму і псіхааналізу. Літаратурны дэбют у «Маладосці».

### Жах

Я выходжу на вуліцу і раптоўна акунаюся ў звонкі лямант матораў, грукат трамвайных колаў, густы, шэры і пануры гарадскі шум. Здаецца, што трапіў у прастору бязмежнасці часу, дзе нічога не рухаецца, але адчувае і пакідае мяне ў нераўнамерным патоку ўсёпаглынальнага хаосу. Інакш не магу апісаць навакольнае: яно палохае, трывожыць. Галіны сакавітых зялёных дрэў працінаюць мяне, спрабуюць паставіць на ногі, укараніць пачуццё спакою, але я ўсё роўна губляюся, падаю, зноў падымаюся — і выяўляю сябе ляжачым ніцма на велізарнай пустой плошчы. Прынамсі, гэтая матавая, нерэальная пустата мне ўяўляецца. Каля мяне ўсё ж праходзяць людзі, праязджаюць машыны.

Цэнтр плошчы накшталт бязлюднага вострава. Тут я адчуваю сябе ў бяспецы. Але гэтае пачуццё знікае, калі мяне абвівае мокрая абалонка дажджу. Не люблю дождж у горадзе: тут ён ліе хутчэй, чым у лесе, брудны, больш зімны і востры, як цярновыя шыпы. І я зноў бачу тое, ад чаго марна спрабаваў схавацца. Заплюшчваю вочы — і замест цемры майму позірку адкрываюцца амарантавыя, лімонныя, ружовыя, блакітныя плямы. Пужаюся, панікую: няўжо звар'яцеў? Білборды і шыльды крам таксама расплываюцца, але гэта мяне не супакойвае.

Мне падаецца, што я ляжу на голых халодных нагах незнаёмай дзяўчыны. Яе скура — увасабленне холаду і льду, бледна-блакітная, з кропкамі чырвонага, сухая, як замыты аксаміт. Дзяўчына гладзіць мяне па галаве, суцяшае, я пачынаю цалаваць яе ногі. Яе цупкая скура раздражняе мае замёрзлыя вусны, і кожны пацалунак раніць іх. Уяўляю, як яна блукае па зімнім полі, басаножкрочыць па снезе, які сціскае яе жыццядайны дух. Дзяўчына шэпча мне на

вуха: *«Цяпер пацалуй мяне».* Я адмаўляюся, баюся расплюшчыць вочы і прачнуцца сярод гнілых вантробаў горада. Яна ўзмацняе голас: *«Цалуй мяне, цалуй у вусны, хачу адчуць твой лагодны подых, мне так халодна, я баюся».* Дзяўчына пачынае гучна стагнаць. Я адкрываю вочы і цягнуся да яе, а мой твар ляціць на сырую бетонную плітку. Кроў з носу цячэ ракою, цёплы ліпкі слой ахутвае мой азызлы разбіты твар, я пачынаю плакаць і, здаецца, засынаю.

Ачомаўшы, паварочваюся на спіну і гляджу на шэрыя нябёсы — халодны дождж змывае з мяне кроў. Нейкая жанчына праходзіць побач і вядзе за руку дзіця. Глядзіць на мяне, затым спрабуе падняць мяне, але я супраціўляюся, і яна пачынае енчыць: *«Падымайся, халера!»* Я не ўстаю. Мне падаецца, што вар'яцее менавіта яна, а не я. Але не, яе папросту няма, яна не існуе. Жанчына — адна велізарная галюцынацыя, як і ўсе бліжэйшыя людзі. Як шум тэлевізара, калі ў яго доўга глядзець, нараджае шум у галаве і вачах, так і дождж, ператвараючыся ў рабы паток, вымалёўвае мудрагелістыя вобразы. Усё знікае, але я разумею, што гэта не сненне — гэта рэальнасць, скажоная натуральнасцю. Не знікае толькі шум аўтамабіляў, матацыклаў і крыклівых дзяцей. Няўжо так і будзе выглядаць апакаліпсіс? Відаць, другое прышэсце адбудзецца непасрэдна тут. Прачнуся, а ўсе падумаюць, што я мёртвы, і ўзнясуць мяне ў неба. Тая жанчына, якая не існуе, верагодна, падумала так.

Спускаючыся ў метро, заўсёды з апаскай пазіраю на людзей, якія праходзяць міма. У іх быццам палымнее агонь, яны гатовыя ім пляваца. Дзіўная старая пранізліва глядзіць на мяне, так і крычыць усім целам: *«Ідзі прэч!»* Я супраціўляюся і, перад тым, як яна гэта пракрычыць, сам крычу на яе, а тая б'е мяне сваёй агіднай, брыдкай кручкаватай трысцінай, харкае балотна-зялёнай масай на лесвіцы, прыгаворваючы: *«Чаго равеш, доўбень?!»*

Спускаюся глыбей, мінуючы турнікеты, і чую, як ва ўнісон зліваецца гудзенне цягнікоў, што прыязджаюць адначасова з абодвух бакоў. У які сядаць? Быць можа, у левы? Тады я паеду ў невядомым мне напрамку. Значыць, у правы. Але і там я ніколі не быў. Заплюшчваю вочы, падыходжу да кагосьці і прашу: *«Пхніце мяне ў любы цягнік, у любы, які захочаце».* Не ведаю хто, але, мяркуючы па хватцы, гэта дужы мужчына, аберуч ён хапае мяне за плечы і штурхае ў вагон. Стукнуўшыся галавой аб дзверы з іншага боку, расплюшчваю вочы. Цягнік рэзка стартуе, я не паспяваю ўцяміць куды. Вагон перапаўняе маўклівы натоўп, утыкнуты ў тэлефоны,— ледзьве выпростваюся, каб агледзецца.

Цягнік едзе доўга, нон-стопам мінуе кожны прыпынак, набіраючы ўсё больш людзей, пакуль, нарэшце, са скрыгатам ды іскрамі не спыняецца. Вадзіцель аб'яўляе: канцавы. Людзі так хутка выходзяць, што выціскаюць мяне наверх, як масу з цюбіка, над сабой, і цяпер нясуць мяне на сваіх плячах, як рок-н-рольную зорку. Святло міргае, не разумею, дзе я, і станцыя мне не знаёмая. Натоўп рухаецца шпарчэй, распаўзаючыся, і хутка быццам ператвараецца ў ваду. Дыскамфорт скоўвае мяне, я пачынаю тануць у натоўпе і раптам грукаюся аб зямлю. Брудны абутак топчацца па маіх грудзях, па твары, і калі я заўважаю востры абцас, які ляціць мне проста ў вока, то закрываю твар рукамі... і зноў апынаюся на той самай плошчы.

Цяпер там няма дажджу, толькі адна вялікая маса шэрага паветра ахутвае мяне. *«Дапамажыце,—* енчу я,— *калі ласка, хто-небудзь... выцягніце мяне з гэтага патоку!»* Але ніхто не спяшаецца на дапамогу. Ніхто мяне не чуе. Толькі з узмацненнем уласнага енку разумею, што гавару праз скаваныя вусны, ды стараюся захоўваць спакой. *«Усё, канец, я паміраю».* Шчымлівая туга сціскае сэрца. *«Прабачце мне!»* — крычу. Ніхто не абарочваецца. *«Хто-небудзь! Хто-небудзь!»* Ніхто не падыходзіць.

Дождж узмацняецца, шум у вушах нарастае, горад цалкам праглынае мяне, а я ўсё крычу з ягонага чэрава, як неспакойнае немаўля...

# КАЗІМІР КАМЕЙША



## Дарога ў людзі

### Трыпціх адной дарогі

Камейша Казімір нарадзіўся 4 снежня 1943 года ў вёсцы Малыя Навікі Стаўбцоўскага раёна Мінскай вобласці. Працаваў літсупрацоўнікам валожынскай раённай газеты «Працоўная слава», старшым рэдактарам на Беларускім радыё, у часопісах «Вясёлка», «Полымя», «Маладосць», «Вожык». Аўтар зборнікаў паэзіі «Восеньскія позвы», «Мембрана», «Нектар», «Тут мае вёсны прычалены», «Сябрына», «Плёс», «Галоўная вярста», «Пярэймы дня», «Лінія лёсу» і інш., вершаваных кніг для дзяцей «Гаёўка», «Буслянка», «Дзятлава кузня», «Добры дзень, шафёр» і кнігі прозы «Духмянае дзіва». Перакладчык твораў расійскіх, украінскіх і славацкіх пісьменнікаў на беларускую мову. Лаўрэат Літаратурнай прэміі СП БССР імя А. Куляшова, літаратурнай прэміі «Залаты Купідон», Нацыянальнай літаратурнай прэміі. Узнагароджаны медалём Францыска Скарыны.

Я з'явіўся на свет у пачатку зімы, у пачатку пушчы і амаль у сярэдзіне веку. Вершы мае заўсёды пісаліся, як самі таго хацелі, ніколі не пытаючыся дазволу. Але яны мае, як і ўсе выхадкі ў іх.

Мне трэба было толькі нарадзіцца, а далей усё за мяне вырашалі Лёс ды Час, якія і прыдумалі маё вучнёўства, падзяліўшы яго ажно на тры школы, на тры даўгаватыя дарогі да іх. На малюнку тое магло б выглядаць так: тры стрэлкі-прамені бягуць ад аднаго і таго ж сонечнага парога, і кожны трапляе ў свой асобны парог школы. Усё нібыта графічна і правільна. А на самай справе ўсё аказалася і мудрэй, і хітрэй, і часам па-прыгодніцку займальна, а зрэдку — і са слязой, ды яшчэ шмат з чым, на што здатныя лясныя дарогі. Беглі хвіліны, гады, прабегла цэлае дзесяцігоддзе... Але навошта я перабольшваю, а тым самым і хлушу? Не, яны зусім не беглі, а ішлі звычайнай хадой, як і павінен ісці сам гадзіннік Часу, заведзены аднойчы Божай рукой. Ішоў ён стрэлкамі, а гэта значыць, нагамі майго часу і веку, пакуль на цыферблаце яго не ўспыхнула лічба — ВОСЕМДЗЕСЯТ. Тады мне раптам зажадалася прайсціся зноў тымі самымі трыма дарогамі. І я папрасіў дазволу на гэта ў сваёй памяці. А ў яе характар мой, мяккі. Яна мне тое дазволіла.

### Дарога першая

Яе даўно ўжо няма, тае дарогі. Нават няма тых трактароў, ды і саміх трактарыстаў, што зааралі яе аднойчы бязлітаснымі плугамі. Поле, у якое яна адразу пераўвасобілася, як і ўсё астатняе пры ёй, было шэрым і камяністым. Кожны год, пачына-

ючы з вясны, збіраюць на ім каменні, а іх з'яўляецца ўсё больш і больш. Кажуць, каменне не расце, тады не зразумела, адкуль яно бярэцца, бо яго ж ніхто не сее. Але жыта на ім расце, не зважаючы на тую камяністасць, густое і каласістае. Летам сарвеш, бывае, доўгую сцябліну-саломіну з ужо добра запалавелым коласам і бачыш, як завузлаваліся на ім трыма каленамі і восень, і зіма, і вясна ў імя самога коласа. Тры калены, якімі адзначыліся межы самога росту сцябла-саломіны, зноў жа, як тыя тры стрэлкі, скіраваны на мае тры школьныя дарогі. Няма прычыны сумнявацца, што Бог любіць троіцу. Любіць яе і ўсё жывое на зямлі.

Ад першай школьнай дарогі застаўся толькі нейкі маленькі хвосцік. Ён нават бачны з акна маёй вясковай хаты. Гэты добра ўтравелы хвосцік, які тройчы за лета косіць матаровай касой малодшы сын вясковай суседкі, надзейна ўлёгся паміж штыкетавым плотам яе гумнішча і старэчым, зарослым слівамі склепам другой суседкі, дом якой прытуліўся да нашага гумна ўжо на іншым, правым, баку вуліцы. Па тым хвосціку панадзіліся гойсаць мясцовыя трактарысты, прызвычаіліся разварочвацца вялікія машыны. І тады абодва сыны маёй першай суседкі самую сярэдзіну таго хвосціка перагарадзілі валунамі, а ў дадатак яшчэ сыпанулі самазвалам добрую гару жвіру. Зроблена гэта было без крыку і гвалту. Але трактарысты адразу зразумелі, чаго ад іх хоча суседка, і пачалі аб'язджаць месца па загуменні. Усё, што засталося за каменнем, перад самым полем неўзабаве зарасло самасейкамі-бярозамі, дзікімі слівамі ды высокай, у пояс, травою. Бярозы растуць хутка. Тыя, якія я памятаў яшчэ танклявымі зеленалістымі дубчыкамі, ужо перараслі мае клёны пры нашым доме, яны добра акругліліся гладкімі бялявымі стваламі, разгалініліся ў кронах. Увесну нават частуюць мяне сваім салодкім бярозавікам. За бярозамі, на самай горцы, след былой дарогі знікае. Далей, амаль яе следам, бяжыць сучасная гулкая асфальтоўка. А ў памяці маёй захавалася старая каляіністая калёсная дарога, што вядзе да суседніх Вялікіх Навікоў. Недзе перад самым нізам перасякалася яна з іншай дарогай, якая пераходзіла ўрэшце ў старыя прысады з дзікіх яблыняў і груш, і забягала ў самы двор школы. Белы, высокі, але аднапавярховы будынак панскага маёнтка выглядаў не так, як усе астатнія выбудовы гэтага ляснога краю. Усе тут, нават мы, малеча, называлі яго «пакоямі». Новы час прапісаўся ў гэтым будынку наступным чынам: правы бок, што выходзіў сваімі дзвярыма да поля, атрымала наша пачатковая школа-чатырохгодка, левы бок з параднымі дзвярыма стаўся клубам і бібліятэкай, а ўсё ніжняе левае крыло адышло пад сельсавет і пошту. Мы былі ўсе разам — вялікія і малыя, начальнікі і дзеці іх падначаленых, настаўнікі і вучні. Была разам з намі і прырода. Вольна раслі тут камлістыя ліпы, клёны ды таполі, густымі аблокамі кучаравіўся белы і сіні бэз. З правага, якраз школьнага, боку шырока разгалінілася магутная лістоўніца. Зялёным вялізным парасонам навісала над самым дахам яе крона. Зімой яна стаяла голай, як і ўсе астатнія дрэвы, і выглядала зусім непрываблівa. З яе, напэўна, насміхаліся маладыя яліны, што раслі непадалёку пры полі.

Хапала тут месца жоўтай і белай акацыі, чаромсе, глогу. А ў двары — і ў адным, і ў другім — усімі колерамі вясёлкі на клумбах і пры самым падмурку зорыста палалі кветкі. Ніхто з нас, вучняў, не ведаў і ніколі не бачыў самога пана, які меў зусім не панскае прозвішча Лысы. Ад старэйшых мы чулі гэта: «Як толькі каля Івянца паказаліся Саветы — пан тут жа збег у Польшчу». Мой бацька сябраваў з чалавекам, які служыў у таго пана і нават спрыяў яму падчас тых уцёкаў, праводзіў да самай польскай мяжы. З'язджаючы з маёнтка, пан быў шчодрым, не шкадаваў свайго дабра, шмат пакінуў і яму, дзядзьку Стасю. Ягоную новую хату на хутары потым цёпла аздаблялі прыгожыя вышыванні самой пані, нейкія квяцістыя дыванкі-насценнікі. Меўся і ў мяне панскі падарунак ад дзядзькі Стася — гіпсавы кот-скарбонка. Не адно лета апускаў я ў яго гіпсавае вушка жоўтыя ды белыя

# Дэпрэсіўная моладзь: як літаратура паглыбілася ў чалавека



Адам Глобус,
пісьменнік, мастак



Валерыя Гілеўская,
пісьменніца, артыстка балета

*У апошні час мы заўважаем тэндэнцыі, якія ўказваюць на тое, што маладыя пісьменнікі ўсё часцей звяртаюцца ў сваіх творах да тэм дэпрэсіі, смерці і тугі. Іх тэксты працятыя адчуваннем безвыходнасці і заняпаду. Мы вырашылі абмеркаваць гэтую сітуацыю з сучаснымі беларускімі паэтамі і пісьменнікамі, каб высветліць прычыны такога становішча, а таксама паспрабаваць спрагназаваць, да чаго гэта можа прывесці.*

● ***— Як вы лічыце, на працягу ўсёй гісторыі моладзь усіх народаў была схільная да дэпрэсіўных настрояў? Ад чаго гэта залежыць? І што з гэтым рабіць?***

**МАЦВЕЙ ЛІШЫН:**

— Калі разглядаць не асобную краіну, а чалавечую натуру ў цэлым, то трэба адзначыць, што «дэпрэсія», ці «дэпрэсіўны настрой», з'яўляецца сімвалічным каталізатарам для творчай дзейнасці. Падлетак, які пераходзіць да больш сталага ўзросту, з яшчэ неакрэплай псіхікай, не заўсёды можа кантраляваць свае эмоцыі ці ўспрымаць вонкавую інфармацыю. Асяроддзе людзей, што не прымае яго сур'ёзна, зніжае самаацэнку, з-за чаго ўзнікае замкнёнасць. Адсюль малады чалавек сустракае расчараванне. Расчараванне ад сяброўства, расчараванне ў адносінах з бацькамі ці настаўнікамі альбо, самае значнае на мой погляд, расчараванне ў першым каханні. У такія моманты хлопцы і дзяўчаты пасля чарговых паразаў пераключаюць сваю ўвагу на «той свет», які не будзе іх адштурхоўваць. Свет, які прымае кожнага, не дае парад, а дбайна агортвае сваёй рэчаіснасцю, дазваляе дакрануцца да забароненага ў звычайным жыцці. Лепшы прыклад таму — менавіта «змрочнае» мастацтва.

**АРЫНА ПРАНІКАВА:**

— Адказ тут толькі адзін — так. Для моладзі характэрны некаторы трагізм, звышчуллівасць, адчуванне страчанасці, разгубленасці, страх перад невядомым. Гэта не новая тэндэнцыя, хто б што ні казаў. І мне здаецца, такія тэмы не проста пажадана, а трэба абмяркоўваць. Хаця б для таго, каб больш зразумець пра сябе. Трэба ўключаць у мастацкія ці адукацыйныя праграмы для моладзі творы з тэматыкамі псіхічнага здароўя і ўнутраных крызісаў, каб дапамагчы адолець стэрэатыпы і страхі, якіх, канешне, вялікае мноства ў кожнага чалавека. А ў падлетка ці юнага дарослага — асабліва.

**АДАМ ГЛОБУС:**

— Ёсць дзень і ёсць ноч, ёсць час актыўны і час спакойны, час мінорны і час аптымістычны, як у жыцці, так і ў літаратуры. Усё ў свеце чаргуецца і змяняецца. Унукі больш любяць каштоўнасці дзядоў, чым каштоўнасці бацькоў. Калі бацькі перабралі з пазітывам і ён зрабіўся паўсюдным, штучным і танным, тады дзеці надзенуць не яркі бацькоўскі строй Арлекі-



Наталля Ігнаценка,
пісьменніца, псіхолаг



Арына Пранікава,
пісьменніца, журналістка



Мацвей Лішын,
паэт, настаўнік

на, а апрануцца ў меланхалічнага П'еро. Праўда, варта падкрэсліць, што П'еро заўжды танцуе побач з Арлекінам, як у тэатры, так і ў літаратуры.

***— Вы бачыце нейкія адметнасці, уласцівыя толькі беларускай літаратуры маладых?***

**ВАЛЕРЫЯ ГІЛЕЎСКАЯ:**

— Так, адметнасць ёсць, і мне гэта падабаецца. Цудоўна, што сярод нас ёсць пэўны «код», які дапамагае нам быць бліжэй адзін да аднаго, лепш разумецца. Калі чытаю тэкст, я адчуваю гэтую «беларускасць» — цяжка патлумачыць. З майго досведу: маладыя беларусы вельмі любяць займеннік «я», параўноўваць сябе з самымі нечаканымі рэчамі, і збольшага — не на сваю карысць. Любяць ухапіцца за некалькі складаных і вялікіх тэм, філасофскіх, і намагацца раскрыць усё ў чатырох радках. Часта сутыкаюся з лішнім, на мой густ, пафасам, асабліва ў грамадзянскай лірыцы. Творчасць пранізана сумам, шэрасцю і безвыходнасцю. Не ва ўсіх, канешне, ды ўсё ж...

Але я разумею, чаму так адбываецца. Мы размаўляем пра пачуцці і стан маладых, а вы ўяўляеце, як зараз цяжка быць гэтым самым маладым? Не зразумела, што будзе далей, што будзе заўтра, у свеце крызісаў, нестабільных абставін. З'явіўся штучны інтэлект, і ўжо здаецца, што праз гадоў дзесяць шмат якія прафесіі наогул знікнуць. Да ўсяго гэтага дадаюцца і заўсёдныя моладзевыя пытанні: хто я, кім хачу стаць, як знайсці сябе, як пабудаваць сям'ю, кар'еру. І разам з гэтым мы назіраем у Instagram, як дзеці ўжо набываюць сабе асабістыя самалёты, і яшчэ больш адчуваем сваю нікчэмнасць. Ну і як тут пісаць пра «сонейка»?

**НАТАЛЛЯ ІГНАЦЕНКА:**

— Трэба разумець, што Беларусь стагоддзямі была памежнай вобласцю паміж Усходам і Захадам, паміж каталіцызмам і праваслаўем. Праз тэрыторыю краіны неаднаразова праходзілі войны: ад напалеонаўскай да абедзвюх сусветных. Другая сусветная вайна асабліва разбурыла Беларусь: каля траціны насельніцтва загінула, сотні вёсак былі спалены. Адным з сімвалаў гэтага жаху стаў мемарыял Хатынь. У выніку ў беларускай культуры сфармавалася глыбінная памяць пра пакуты, пра бяссілле чалавека перад катастрофамі гісторыі. Да таго ж беларуская прырода — балоты, павольныя рэкі, туманы — задаюць меланхалічны тон. Беларусь часта называюць краінай ціхага гора, і гэта не песімізм, а ўменне глыбока адчуваць і памятаць. У Янкі Купалы ці Алеся Адамовіча гэты смутак — не слабасць, а форма сілы і памяці. Магчыма, адной з прычын дэпрэсіўнай афарбоўкі твораў сучасных беларускіх пісьменнікаў з'яўляецца генетычная памяць, сфармаваная ў жыхароў Беларусі на падсвядомым узроўні.